пераўтварэннем і самога суб'екта пазнання — студэнта, таму што ў ходзе набыцця ім вопыту даследчай дзейнасці адбываецца развіцце асобы ў цэлым, і перш за ўсе інтэлекту, што стварае педагагічную каштоўнасць навучання.

Практычнае укараненне навучальна-даследчага прынцыпу ў працэс бакалаўрскай і магістарскай падрыхтоўкі паказала, што складанасці ў правядзенні заняткаў з выкарыстаннем прынцыпу апраўдваюцца значнасцю вынікаў, дасягнутых з яго дапамогай. Найбольш значнымі вынікамі з'яўляюцца прабуджэнне ў будучых настаўнікаў пазнавальнай актыўнасці, развіццё самастойнасці і імкнення да пошуку, творчага асэнсавання педагагічнай рэальнасці.

У ходзе ўкаранення праграмы па рэалізацыі навучальна-даследчага прынцыпу ў сістэме шматузроўневай педагагічнай адукацыі вызначыліся пэўныя праблемы, над якімі яшчэ трэба працаваць. Гэта, перш за ўсё, устанаўленне больш інтэнсіўных арганічных міжпрадметных сувязяў, прафіліраванне агульных курсаў, пошук такіх метадаў кантролю за дзейнасцю кафедр, якія стымулююць пераход ад этапу метадычнай адпрацоўкі шляхоў рэалізацыі навучальна-даследчага прынцыпу ў дзейнасці бакалаўрыята і магістратуры да іх практычнай рэалізацыі.

## РЭАЛІЗАЦЫЯ НАВУЧАЛЬНА-ДАСЛЕДЧАГА ПРЫНЦЫПУ Ў СТАНДАРТАХ ВЫШЭЙШАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ

*Ціханаў Л.Н, Быкадораў Ю.А.*

Адным з галоўных шляхоў паспяховай рэалізацыі навучальна-даследчага прынцыпу ў практыцы падрыхтоўкі будучых педагогаў з'яўляецца удасканаленне арганізацыі і зместу навучальнага працэсу, як асновы ўсёй дзейнасці педагагічнай навучальнай установы. Некалькі дзесяцігоддзяў такую аснову складалі вучэбныя планы і праграмы дысцыплін па спецыяльнасцях.

Кардынальныя змены ў гэтай вобласці адбыліся ў апошнія гады. Зараз фундаментам вучэбна-выхаваўчага працэсу з'яўляюцца адукацыйныя стандарты, якія вызначаюць агульныя патрабаванні да адукаванасці абітурыентаў, да структуры вучэбнага плану, да ведаў і уменняў па цыклах дысцыплін, да характарыстыкі зместу прафесійнай дзейнасці выпускнікоў і г.д.

Калектывамі факультэтаў і кафедраў Беларускага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта імя Максіма Танка распрацаваны шэраг адукацыйных стандартаў для педагагічных спецыяльнасцей [1–11]. У стандартах на узроўні характарыстык і патрабаванняў закладзены умовы рэалізацыі навучальна-даследчага прынцыпу ў дзейнасці педагагічных ВНУ і педагагічных патокаў класічных універсітэтаў.



Распрацаваныя адукацыйныя стандарты па педагагічных спецыяльнасцях маюць наступныя раздзелы:

1. Галіна прымянення.
2. Нарматыўныя спасылкі.
3. Тэрміны і азначэнні.
4. Агульная характарыстыка спецыяльнасці.
5. Патрабаванні да узроўню адукаванасці абітурыента і складу ўступных выпрабаванняў.
6. Характарыстыка зместу прафесійнай дзейнасці спецыяліста.
7. Кваліфікацыйная характарыстыка спецыяліста.
8. Патрабаванні да ведаў і уменняў па цыклах дысцыплін.
9. Структура вучэбнага плана спецыяльнасці.
10. Мінімум зместу адукацыйнай праграмы па цыклах дысцыплін.
11. Кваліфікацыйная атэстацыя.
12. Патрабаванні да умоў рэалізацыі асноўнай адукацыйнай праграмы.

Раздзелы стандарта высвятляюць розныя бакі падрыхтоўкі спецыяліста і у рознай ступені могуць быць звязаны з рэалізацыяй навучальна-даследчага прынцыпу. Найбольш змястоўнымі з гэтага пункту гледжання з'яўляюцца раздзелы 6, 7.

Раздзел 6 адукацыйных стандартаў у наяўным выглядзе змяшчае патрабаванні да навукова-даследчай падрыхтоўкі спецыялістаў. Вось так, напрыклад, гэты раздзел выглядае ў стандарце па спецыяльнасці П.01.01.00 "Матэматыка" [1] (падкрэсліванне зроблена аўтарамі артыкула).

### 6.1. Аб'екты прафесійнай дзейнасці

Аб'ектамі прафесійнай дзейнасці спецыяліста з'яўляюцца: сярэднія агульнаадукацыйныя поўныя (няпоўныя) школы, гімназіі, ліцэі, сярэднія спецыяльныя установы, каледжы, школы і класы з паглыбленым вывучэннем матэматыкі, фізікі, інфарматыкі,пазашкольныя навучальныя установы (палацы моладзі і школьнікаў), органы адукацыі, навуковыя установы матэматычнага і псіхолага-педагагічнага профілю.

### 6.2. Сфера прафесійнай дзейнасці

Сфера прафесійнай дзейнасці спецыяліста на аснове сукупнасці фундаментальных агульнанавуковых, агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў:

– выкладанне матэматыкі, фізікі, інфарматыкі ў сярэдніх навучальных установах рознага тыпу;

– кіраўніцтва гурткоўай і навукова-даследчай працай школьнікаў у пазашкольных навучальных установах;

– метадычная і інспектарская праца ва установах адукацыі;

– даследчая і навукова-педагагічная праца ў навуковых установах.

**6.3. Віды прафесійнай дзейнасці**

Спецыяліст можа ажыццяўляць прафесійную дзейнасць па наступных накірунках:

– вучэбным;
– навукова-метадычным;
– навуковым (навукова-даследчым);
– арганізацыйна-упраўленчым;
– культурна-асветніцкім;
– кансультатыўным.

**6.4. Задачы прафесійнай дзейнасці**

Спецыяліст здольны вырашаць наступныя прафесійныя задачы:

– кіраванне вучэбна-пазнавальнай, творчай і іншымі відамі дзейнасці навучэнцаў у адпаведнасці з адукацыйнымі стандартамі;
– рэгуляванне (карэкціроўка) адносін і узаемадзеянняў у педагагічным працэсе;
– вызначэнне і выкарыстанне аптымальных формаў, метадаў, сродкаў навучання і выхавання;
– правядзенне з навучэнцамі заняткаў (урокаў, гульняў, семінараў і інш.);
– арганізацыя індывідуальнай і самастойнай працы навучэнцаў;
– развіццё навыкаў працы вучняў з вучэбнай літаратурай, падручнікамі і вучэбнымі дапаможнікамі;
– правядзенне педагагічных даследаванняў.

**6.5. Функцыі прафесійнай дзейнасці:**

– інфармацыйныя;
– развіццёвыя;
– матывацыйныя;
– арганізатарскія;
– камунікатыўныя;
– даследчыя.

А вось вытрымкі з раздзела 7, якія з'яўляецца кваліфікацыйнай характарыстыкай спецыяліста, адукацыйнага стандарта па спецыяльнасці П.01.05.00 "Беларуская мова і літаратура" [2].

**7.1. Прызначэнне спецыяліста**

Спецыяліст павінен быць падрыхтаваны да выкладчыцкай, метадычнай, арганізацыйна-упраўленчай, лектарска-асветніцкай працы ў галіне агульнай сярэдняй адукацыі, навукова-даследчай дзейнасці.

Спецыяліст прызначаны для працы па выкладанні беларускай мовы і літаратуры, сусветнай і айчыннай культуры, замежнай мовы ў сярэдніх навучальных установах рознага тыпу, па планаванні вучэбнага працэсу, арганізацыі заняткаў, кіраўніцтва гуртковай і навукова-даследчай працай школьнікаў у пазашкольных навучальных установах, сярэдніх агульнаадукацыйных поўных (няпоўных) школах, гімназіях, ліцэях, сярэдніх спецыяльных установах, каледжах, для працы ў установах адукацыі, навуковых установах псіхолага-педагагічнага і філалагічнага профілю, вышэйшых навучальных установах, а таксама ў рэдакцыях газет і часопісаў, на радыё і тэлебачанні...

**7.4. Агульныя патрабаванні да прафесійных уменняў спецыяліста**

Спецыяліст ... павінен умець:

– валодаць сістэмай ведаў пра сферу адукацыі, сутнасць зместу і структуры адукацыйных стандартаў;
– валодаць сістэмай ведаў пра гісторыю і сучасныя напрамкі развіцця псіхолага-педагагічных канцэпцый і прадметных методык;
– валодаць сістэмай ведаў пра чалавека як суб'екта адукацыйнага працэсу, пра яго ўзроставыя, індывідуальныя асаблівасці, сацыяльныя фактары развіцця;

...

– валодаць уменнямі псіхолага-педагагічнай дыягностыкі;
– валодаць уменнямі праектавання, рэалізацыі, ацэньвання і карэкцыі адукацыйнага працэсу;
– валодаць асновамі распрацоўкі вучэбна-праграмнай дакументацыі, выкарыстоўваць іх для фарміравання зместу навучання;
– выкарыстоўваць асновы арганізацыі вопытна-эксперыментальнай і даследчай працы ў сферы адукацыі.

Раздзел 9 адукацыйных стандартаў змяшчае структуру вучэбнага плана спецыяльнасці. У гэтым раздзеле па кожнай дысцыпліне акрэслена агульная колькасць гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне дысцыпліны, і ў тым ліку колькасць аудыторных гадзін. Такім чынам, стандарт пры стварэнні вучэбнага плана пакідае магчымасць вызначэння аптымальных суадносін паміж гадзінамі на лекцыйныя, практычныя і лабараторныя заняткі, што вельмі важна пры рэалізацыі навучальна-даследчага прынцыпу ў вучэбна-выхаваўчым працэсе.

Раздзел 11 акрэслівае толькі агульныя падыходы да кваліфікацыйнай атэстацыі выпускніка.

**11. Кваліфікацыйная атэстацыя**

Пры правядзенні кваліфікацыйнай атэстацыі павінна быць забяспечана выкананне дзяржаўных патрабаванняў да зместу адукацыйнай праграмы і ўзроўню падрыхтоўкі спецыяліста.

Пры падрыхтоўцы спецыяліста з кваліфікацыяй ... ажыццяўляюцца наступныя віды кваліфікацыйнай атэстацыі:

– экзамены, дыферэнцыраваныя залікі і залікі па вывучаемых дысцыплінах (іх пералік устанауліваецца ВНУ);

– атэстацыя пасля вывучэння асноуных дысцыплін гуманітарна-сацыяльнага цыклу і цыклу агульна-навуковых і агульна-прафесійных дысцыплін;

– выніковая дзяржауная атэстацыя ў выглядзе абароны дыпломнай працы і здачы дзяржауных экзаменау або толькі здачы дзяржауных экзаменау у дзяржаунай экзаменацыйнай камісіі.

Такім чынам, методыка арганізацыі атэстацыі стандартам не абмяжоуваецца, і ствараюцца пэуныя магчымасці арганізаваць атэстацыю з прымяненнем навучальна-даследчага прынцыпу. Не абмяжоуваецца, у прыватнасці, і колькасць курсавых прац, той формы работы, якая дапамагае развіццю навукова-даследчых здольнасцяу студэнтау.

Падводзячы вынікі, можна з упэуненасцю сказаць, што стварэнне адукацыйных стандартау па педагагічных спецыяльнасцях будзе у значнай ступені спрыяць укараненню навучальна-даследчага прынцыпу у дзейнасць педагагічных навучальных установау па падрыхтоуцы будучых педагогау-настаунікау.

### *Літаратура*


1. РД РБ 02100.5.087-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.01.01.00 «Математика» с дополнительными специальностями П.01.01.01 «Физика», П.01.01.02 «Информатика». — Мн., 2000.
2. РД РБ 02100.5.094-98. Адукацыйны стандарт. Вышэйшая адукацыя. Спецыяльнасць П.02.05.00 «Беларуская мова і літаратура» з дадатковымі спецыяльнасцямі П.02.05.02 «Сусветная і айчынная культура», П.02.05.04 «Замежная мова», П.02.05.09 «Дзіцячая і юнацкая журналістыка». — Мн., 2000.
3. РД РБ 02100.5.088-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.01.02.00 «Физика» с дополнительными специальностями П.01.02.01 «Математика», П.01.02.02 «Астрономия», П.01.02.03 «Информатика», П.01.02.04 «Технический труд», П.01.02.05 «Техническое творчество». — Мн., 2000.
4. РД РБ 02100.5.090-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.01.04.00 «Биология» с дополнительными специальностями П.01.04.01 «Химия», П.01.04.02 «География», П.01.04.04 «Практическая психология». — Мн., 2000.
5. РД РБ 02100.5.091-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.01.05.00 «География» с дополнительными специальностями П.01.05.01 «Биология», П.01.05.06 «Белорусский язык и литература». — Мн., 2000.





6. РД РБ 02100.5.092-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.02.01.00 «История» с дополнительными специальностями П.02.01.03 «Иностранный язык», П.02.01.08 «Социально-политические дисциплины», П.02.01.09 «Религиоведение». — Мн., 2000.
7. РД РБ 02100.5.093-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.02.03.00 «Музыка и пение» с дополнительными специальностями П.02.03.01 «Мировая и отечественная культура», П.02.03.05 «Социальная педагогика». — Мн., 2000.
8. РД РБ 02100.5.095-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.02.06.00 «Русский язык и литература» с дополнительной специальностью П.02.06.01 «Белорусский язык и литература». — Мн., 2000.
9. РД РБ 02100.5.096-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.04.01.00 «Педагогика и психология дошкольная» с дополнительными специальностями П.04.01.01 «Иностранный язык», П.04.01.02 «Физическая культура», П.04.01.03 «Изобразительная деятельность», П.04.01.05 «Практическая психология». — Мн., 2000.
10. РД РБ 02100.5.097-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность П.04.02.00 «Педагогика и методика начального обучения» с дополнительными специальностями П.04.02.01 «Белорусский язык и литература», П.04.02.02 «Изобразительное искусство», П.04.02.05 «Иностранный язык», П.04.02.06 «Практическая психология», П.04.02.07 «Музыка и пение», П.04.02.08 «Социальная педагогика». — Мн., 2000.
11. РД РБ 02100.5.102-98. Образовательный стандарт. Высшее образование. Специальность Г.07.01.00 «Психология». — Мн., 2000.


## ПРАКТЫКА РЭАЛІЗАЦЫІ ВУЧЭБНА-ДАСЛЕДЧАГА ПРЫНЦЫПУ ПРЫ ПАДРЫХТОУЦЫ ВУЧЭБНЫХ ПЛАНАУ І ПРАГРАМ ДЛЯ БАКАЛАУРАУ І МАГІСТРАУ

***Яроміна Г.В.***

Бакалаурыят і магістратура у Беларускім дзяржауным педагагічным універсітэце імя Максіма Танка займаюць прыярытэтнае месца у сістэме бесперапыннай педагагічнай адукацыі і з'яуляюцца адной з формау падрыхтоукі навукова-педагагічных кадрау. За перыяд навучання будучыя магістры павінны атрымаць цэлую сістэму тэарэтычных ведау па разнастайных вучэбных дысцыплінах, авалодаць навыкамі і уменнямі вядзення вучэбнай і выхавaучай працы са студэнтамі, навучэнцамі каледжаў, гімназій, ліцэяу, а таксама авалодаць метадамі і сродкамі на-вуковых даследаванняу. З улікам сказанага распрацоуваліся навуковыя асновы рэалізацыі вучэбна-даследчага прынцыпу пры падрыхтоуцы вучэбных планау і праграм.